

# МАНІТОРЫНГ ПРАВА НА СВАБОДУ СХОДАЎ

## БЕЛАРУСЬ 2019

#right2freeassembly

Аўтары:

Наталля Сацункевіч (Праваабарончы цэнтр “Вясна”);
Дзмітрый Чарных (Беларускі Хельсінкскі камітэта);
Наста Лойка (Human Constanta)

Апублікавана ў красавіку 2020 года

*Даклад аб маніторынгу быў падрыхтаваны ў рамках рэгіянальнага праекта “Маніторынг права на свабоду мірных сходаў”, які ажыццяўляецца Еўрапейскім цэнтрам непрыбытковага права (ECNL). Праект стаў магчымы дзякуючы Міжнароднаму цэнтру некамэрцыйнага права (ICNL) праз Civic Space Initiative, і фінансуецца ўрадам Швецыі. Урад Швецыі не абавязкова падзяляе выказаныя ў дакладзе меркаванні. Аўтары нясуць поўную адказнасць за змест даклада.*

*Гэта выданне часткова патрымана Еўрапейскім Саюзам. Змест даклада з’яўляеццв адказнасцю аўтараў і не абавязкова адлюстроўвае погляды Еўрапейскага Саюза.*

Co-funded by the European Union

Аўтарскія правы © 2020 Еўрапейскі цэнтрам некамерцыйнага права ECNL, Вясна, Беларускі Хельсінскі Камітэт і Human Constanta. Усе правы ахоўваюцца.

(фота на вокладцы прадстаўлена Controlby)

# Змест


Уводзіны . . . . . . . . . . . . . . . 4

Прававы аналіз. . . . . . . . . 5

Колькасць мірных сходаў у 2019 годзе . . . . . . . . . . . . . . . . 11

Мірныя сходы ў 2019 годзе. . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

Уплыў змен у заканадаўстве . . . . . . . . . . . 13

Месцы правядзення масавых мерапрыемстваў. . . . . . . . . . 13

Тэматыка сходаў. . . . . . . . . . 14

Колькасць удзельнікаў сходаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

Апытанне арганізатараў сходаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

Права на свабоду сходаў дзяцей і падлеткаў . . . 19

Рэалізацыя свабоды сходаў у выбарчы перыяд. . . . . . . . . . . . . . . 21

Адміністратыўны пераслед за рэалізацыю свабоды мірных сходаў і выказвання меркавання . . . . . . . . . . . 23

Маніторынг мірных сходаў. . . . . . . . . . . . . . . . . 25

Рэкамендацыі ................ 29

Ураду Беларусі . . . . . . . . . . . . 29

Органам мясцовай улады . . 29

Органам аховы правапарадку . . . . . . . . . . . . . 30

Міжнароднай супольнасці . 30



# Уводзіны

Свабода мірных сходаў - як адно з найважнейшых правоў чалавека, падлягае ахове і забеспячэнню з боку дзяржавы. Разам з іншымі грамадзянскімі і палітычнымі правамі яно ляжыць у аснове эфектыўнай дэмакратычнай сістэмы. Рэалізацыя права на свабоду сходаў у Беларусі моцна абмежавана, як на заканадаўчым узроўні, так і на практыцы. Гэтае пытанне традыцыйна выклікае непакой з боку міжнародных праваабарончых інстытуцыяў, а таксама грамадзянскай супольнасці.

У студзені 2019 года ўступілі ў сілу змены ў закон “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь”, які рэгулюе і свабоду сходаў. Ня гледзячы на абяцаньні лібералізацыі з боку ўладаў, сітуацыя са свабодай сходаў у Беларусі у 2019 годзе пагоршылася. Некаторыя традыцыйныя пратэстныя акцыі прайшлі ў змененым фармаце або наогул былі адмененыя.

У дадзеным дакладзе прыведзены аналіз прававога рэгулявання мірных сходаў у Беларусі. Сабрана і прааналізавана колькасная і якасная статыстыка мірных сходаў, якія прайшлі ў Беларусі ў 2019 годзе. Прыведзены рэгультаты вочнага маніторынгу 21 мірнага сходу. Таксама закрануты пытанні рэалізацыі права на свабоду сходаў дзецьмі, адміністрацыйнага пераследу і асаблівасці правядзення мірных сходаў падчас выбарчых кампаній. Асобна прыведзены рэкамендацыі для зацікаўленых бакоў.

У снежні мінулага года ў розных гарадах Беларусі прайшлі акцыі пратэсту супраць паглыбленай інтэграцыі з Расіяй. Па дадзеных Праваабарончага цэнтра “Вясна” за снежань і студзень у краіне прайшло больш за 170 судоў, агульная сума штрафаў склала - каля $ 60 000, а агульная колькасць дзён адміністратыўнага арышту для 12 актывістаў - 330. Ва ўсіх выпадку людзі прызнаныя вінаватымі ва ўдзеле несанкцыянаваных сходах альбо ў ажыццяўленні заклікаў да ўдзелу.

Даклад па свабодзе мірных сходаў падрыхтаваны кааліцыяй праваабарончых арганізацый і разлічаны на щирокую зацікаўленую аўдыторыю, уключаючы дзяржаўных асобаў, адказных за забеспячэнне дадзенага права.



# Прававы аналіз

26 студзеня 2019 года ўступіў у сілу Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 125-З «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь" Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь». Асноўныя новаўвядзенні, прадугледжаныя законам, тычыліся наступнага:

1 у Закон «Аб масавых мерапрыемствах» уведзены спецыяльны артыкул 9-1. Ён прадугледзеў паведамляльны парадак правядзення масавых мерапрыемстваў у пастаянных месцах для іх правядзення, якія спецыяльна вызначаны для гэтай мэты (да ўнясення гэтых зменаў усе масавыя мерапрыемствы маглі праводзіцца толькі пасля атрымання дазволу ад мясцовых уладаў). У цяперашні час пастаянныя месцы для правядзення масавых мерапрыемстваў вызначаюцца рашэннямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Аналіз гэтых рашэнняў паказвае, што месцы для правядзення масавых мерапрыемстваў вельмі нязручныя, яны размешчаны далёка ад цэнтраў гарадоў і мясцовых органаў улады (паркі, стадыёны і г.д.).

Для правядзення такога мерапрыемства трэба падаць паведамленне ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган не пазней чым за 10 дзён да мяркуемай даты яго правядзення. У паведамленні павінны быць пазначаны: мэта, тып, месца правядзення, крыніца фінансавання масавага мерапрыемства; дата, час яго пачатку і заканчэння; прыкладная колькасць удзельнікаў; прозвішча, імя, імя па бацьку арганізатара (арганізатараў); інфармацыя аб выкарыстанні піратэхнічных вырабаў (тып, колькасць) і адкрытага агню (калі масавае мерапрыемства будзе праводзіцца з іх выкарыстаннем); а таксама меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі падчас масавага мерапрыемства і меры, звязаныя з аказаннем медыцынскай дапамогі і ўборкай тэрыторыі пасля правядзення мерапрыемства.

Законам таксама прадугледжана, што мясцовы выканаўчы і распарадчы орган абавязаны не пазней чым за пяць дзён да даты правядзення масавага мерапрыемства паведаміць у пісьмовай форме арганізатару (арганізатарам) аб недапушчальнасці правядзення масавага мерапрыемства і неабходнасці спынення падрыхтоўкі да яго ў выпадку, калі:

- у мясцовы выканаўчы і распарадчы орган раней паступіла паведамленне ад іншага заяўніка аб правядзенні ў тым жа месцы і ў той жа час масавага мерапрыемства. Прыярытэт мае заяўнік, які падаў паведамленне першым;
- пададзенае паведамленне не адпавядае патрабаванням Закона.

Важна падкрэсліць, што калі арганізатар сходу вырашыць правесці яго ў месцы, якое не прызначана для пастаяннага правядзення масавых мерапрыемстваў, ён павінен падаць заяву ў агульным парадку, у прыватнасці, не пазней, чым за 15 дзён да мяркуемай даты масавага мерапрыемства.

Акрамя таго, закон прадугледжвае больш доўгі спіс падстаў для забароны масавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца з дазволу мясцовага выканаўчага органа, а не шляхам паведамлення. Так, згодна з часткай 3 артыкула 6 Закона "Аб масавых мерапрыемствах" рашэнне кіраўніка мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або яго намесніка аб дазволе або забароне правядзення масавага мерапрыемства прымаецца з улікам даты, месца, часу яго правядзення, колькасці ўдзельнікаў, умоў надвор'я, аплаты паслуг па ахове грамадскага парадку, што аказваюцца органамі ўнутраных спраў, расходаў, звязаных з медыцынскім абслугоўваннем, уборкай тэрыторыі пасля правядзення на ёй масавага мерапрыемства і іншых абставінаў, якія ўплываюць на забеспячэнне грамадскай бяспекі.

Арганізатар масавага мерапрыемства, гэтак жа, як і пры правядзенні іншых масавых мерапрыемстваў, абавязаны ўнесці аплату паслуг па ахове грамадскага парадку, расходаў, звязаных з медыцынскім абслугоўваннем, уборкай тэрыторыі пасля правядзення на ёй масавага мерапрыемства.

2 уведзены абавязак журналіста мець пры сабе дакумент, які сведчыць асобу, а таксама службовае пасведчанне журналіста сродку масавай інфармацыі, зарэгістраванага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, альбо дакумент, які пацвярджае акрэдытацыю журналіста замежнага сродку масавай інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Акрамя таго, журналіст абавязаны мець ясна бачны адметны знак прадстаўніка СМІ (частка 5 артыкула 10 Закона).

3 пашыраны пералік мерапрыемстваў, якія трапляюць пад рэгуляванне Закона «Аб масавых мерапрыемствах». Так, акрамя спартыўна-масавых, культурна-відовішчных, іншых відовішчных і рэлігійных мерапрыемстваў, любое культурнае мерапрыемства патрабуе дазвола мясцовага выканаўчага і распарадчага органа (частка 3 артыкула 2 Закона). Такім чынам, дадзенай нормай фармальна пашырана кола масавых мерапрыемстваў, якія падпадаюць пад рэгуляванне Закона.

4 уведзена дадатковае патрабаванне да арганізатараў масавых мерапрыемстваў. Раней фізічным асобам было забаронена быць арганізатарамі масавага мерапрыемства, калі яны дапусцілі парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавага мерапрыемства, на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое парушэнне.
Зараз уводзіцца забарона выступаць арганізатарамі масавага мерапрыемства

асобам, якія маюць нязнятую або непагашаную судзімасць за здзяйсненне злачынстваў супраць міру і бяспекі чалавецтва, злачынстваў супраць грамадскай бяспекі, злачынстваў супраць грамадскага парадку і грамадскай маральнасці або злачынстваў супраць дзяржавы і парадку ажыццяўлення ўлады і кіравання (частка 6 артыкула 4 Закона).

5 У цяперашні час Закон таксама забараняе арганізатару масавага мерапрыемства або іншым асобам публічна заклікаць да арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства да атрымання дазволу на яго правядзенне (падачы паведамлення аб яго правядзенні). Выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі, Інтэрнэту ці іншых сродкаў для паведамлення пра дату, месца і час масавага мерапрыемства не дапускаецца, роўна як і выраб або распаўсюд у гэтых мэтах улётак, плакатаў і іншых матэрыялаў (частка 2 артыкула 8 Закона).

Прынятыя папраўкі ў нязначнай ступені палепшылі Закон «Аб масавых мерапрыемствах». У прыватнасці, увядзенне паведамляльнага, а не дазвольнага парадку правядзення масавых мерапрыемстваў у пастаянных месцах для іх правядзення, можна было б разглядаць як пазітыўны крок у напрамку поўнай рэалізацыі права на свабоду сходаў. Аднак вызначыныя мясцовымі органамі ўлады пастаянныя месцы для правядзення масавых мерапрыемстваў часта знаходзяцца ў аддаленых месцах, і для адпаведнасці еўрапейскім стандартам неабходна, каб сходы маглі праходзіць у межах бачнасці і чутнасці для мэтавай аўдыторыі. А ў цяперашні час пра гэта казаць немагчыма.

Унесеныя змены і дапаўненні таксама дазваляюць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам паведаміць арганізатару, які падаў паведамленне аб правядзення масавага мерапрыемства, аб яго недапушчальнасці, калі паведамленне не адпавядае патрабаванням Закона. Варта адзначыць, што ў большасці выпадкаў у правядзенні масавых мерапрыемстваў адмаўляецца менавіта з-за невыканання патрабаванняў Закона «Аб масавых мерапрыемствах». Пры гэтым, як правіла, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган не ўдакладняе, якія менавіта палажэнні Закона не былі выкананыя. У выніку арганізатары павінны падаць яшчэ адну заяўку ці скаргу ў суд, каб высветліць канкрэтныя прычыны, якія паслужылі падставай для забароны правядзення масавага мерапрыемства.

Законам ад 17 ліпеня 2018 г. № 125-З на Савет Міністраў (Урад) ускладзена задача вызначыць парадак аплаты паслуг па ахове грамадскага парадку, што аказваюцца органамі ўнутраных спраў, расходаў, звязаных з медыцынскім абслугоўваннем, уборкай тэрыторыі пасля правядзення на ёй масавага мерапрыемства. 24 студзеня 2019 года Савет Міністраў прыняў пастанову № 49, якой зацвердзіў парадак аплаты вышэйзгаданых паслуг.

Пастановай № 49, у прыватнасці, установлена, што пасля атрымання дазволу на правядзенне масавага мерапрыемства (ці пры адсутнасці яго забароны) арганізатар павінен заключыць дамовы аб прадастаўленні адпаведных паслуг з тэрытарыяльным органам унутраных спраў, установай аховы здароўя і арганізацыяй, якая ажыццяўляе ўборку тэрыторыі, не

пазней двух дзён да запланаванай даты правядзення такога мерапрыемства.

Пастановай № 49 прадугледжана, што арганізатар масавага мерапрыемства павінен аплаціць паслугі органа ўнутраных спраў па ахове грамадскага парадку ў наступных памерах:

- 3 базавыя велічыні – калі колькасць удзельнікаў не перавышае 10 чалавек;
- 25 базавых велічынь – калі колькасць удзельнікаў складае ад 11 да 100 чалавек;
- 150 базавых велічынь – калі колькасць удзельнікаў складае ад 101 да 1000 чалавек;
- 250 базавых велічынь – калі колькасць удзельнікаў перавышае 1000 чалавек.

Акрамя таго, прымяняецца павышаючы каэфіцыент 1,5 пры правядзенні масавых мерапрыемстваў у месцах, якія не аднесены мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі да пастаянных месцаў для іх правядзення.

Акрамя аплаты паслуг па ахове грамадскага парадку арганізатар таксама павінен аплаціць выдаткі спецыялізаваных арганізацый (медыцынскіх і камунальных службаў), у склад якіх уключаюцца:

- выдаткі на выплату заработнай платы работнікам зыходзячы з іх катэгорыі, колькасці, часу ўдзелу ў масавым мерапрыемстве;
- выдаткі на выплату абавязковых страхавых узносаў работнікаў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- кошт зрасходаваных на правядзенне масавага мерапрыемства прадметаў забеспячэння і матэрыялаў, у тым ліку лекавых сродкаў, вырабаў медыцынскага прызначэння, мыйных сродкаў;
- ускосныя (накладныя) выдаткі спецыялізаваных арганізацый;
- падаткі, зборы, іншыя абавязковыя плацяжы ў рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты, прадугледжаныя заканадаўствам.

Арганізатар масавага мерапрыемства павінен аплаціць паслугі органаў унутраных спраў і расходаў спецыялізаваных арганізацый не пазней дзесяці дзён пасля правядзення масавага мерапрыемства. Рознагалоссі паміж арганізатарам масавага мерапрыемства і органам унутраных спраў, спецыялізаванай арганізацыяй па пытаннях аплаты паслуг і выдаткаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з умовамі заключаных дамоў шляхам правядзення перамоў або ў судовым парадку.

У той жа час Пастанова № 49 не распаўсюджваецца на масавыя мерапрыемствы, правядзенне якіх фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, а таксама на наступныя выпадкі:

- сходы калектываў работнікаў, палітычных партый, прафсаюзаў, рэлігійных і іншых арганізацый, якія праводзяцца ў памяшканнях у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, статутамі названых арганізацый (палажэннямі аб іх);
- сходы, якія праводзяцца ў

адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах;

- пікетаванне для збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, якое праводзіцца ў месцах, не забароненых для гэтай мэты мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;
- сходы, мітынгі і пікетаванне, што арганізуюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, іх даверанымі асобамі ў парадку, прадугледжаным арт. 45-1 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь;
- масавыя мерапрыемствы, якія праводзяцца па рашэнні дзяржаўных органаў.

Вышэйпералічаныя патрабаванні па аплаце названых паслуг аказалі стрымліваючы ўплыў на свабоду сходаў. Так, арганізатары мірнага сходу "Дзень Волі 2019" у Мінску заключылі дамову з ГУУС Мінгарвыканкама на ахову грамадскага парадку, але адмовіліся рабіць аплату з-за нездавальняючай якасці аказаных паслуг. Нягледзячы на тое, што, як адзначалася вышэй, падобныя спрэчкі павінны вырашацца ў ходзе перамоваў альбо ў судовым парадку, чацвярых арганізатараў дадзенага масавага мерапрыемства прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу на суму ў 30 базавых велічынь для кожнага за парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў (арт. 23.34 КаАП).

Арганізатары традыцыйнай акцыі Чарнобыльскі шлях (праводзіцца штогод 26 красавіка, пачынаючы з 1989 года, у дзень катастрофы на Чарнобыльскай АЭС) звярнуліся ў Мінгарвыканкам з просьбай вызваліць іх ад аплаты паслуг, але атрымалі адмову. Арганізатары адклікалі заяву аб правядзенні масавага мерапрыемства за суткі да даты яго правядзення, матывуючы гэта адсутнасцю сродкаў на аплату паслуг.

Беларуская канфедэрацыя дэмакратычных прафсаюзаў адмовілася ад правядзення традыцыйных вулічных акцый 1 мая 2019 года – у Міжнародны дзень салідарнасці працоўных. Арганізатары матывавалі сваю адмову нежаданнем і немагчымасцю аплачваць паслугі па ахове грамадскага парадку, медыцынскім абслугоўванні і ўборцы тэрыторыі.

Такім чынам, унесеныя змены ў Закон «Аб масавых мерапрыемствах», якія прадугледжваюць паведамляльны парадак некаторых сходаў, фактычна нівеліраваныя высокімі тарыфамі на паслугі, усталяванымі пастановай Савета Міністраў ад 24 студзеня 2019 г. № 49.

Характэрна, што Камітэт ААН па правах чалавека, пры разглядзе пятага перыядычнага дакладу Рэспублікі Беларусь аб выкананні Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (8-9 кастрычніка 2018 году), адзначыўшы папраўкі, унесеныя ў 2018 годзе ў Закон «Аб масавых мерапрыемствах», якія ўстанаўліваюць паведамляльны парадак правядзення сходаў, выказаў занепакоенасць тым, што ён тычыцца толькі сходаў, якія праводзяцца ў спецыяльна адведзеных уладамі пастаянных месцах, якія знаходзяцца, як сцвярджаецца, удалечыні ад цэнтра горада. Камітэт

выказаў асаблівую занепакоенасць наступнымі неапраўданымі перашкодамі ў рэалізацыі права на мірныя сходы:

- агульным патрабаваннем атрымання дазволу на правядзенне любых акцый пратэсту;
- жорсткімі ўмовамі выдачы дазволаў, у тым ліку абавязацельствамі прытрымлівацца грамадскага парадку і нормы бяспекі, а таксама становішчам аб забеспячэнні медыцынскай дапамогі і ўборкі ў месцах правядзення мерапрыемстваў;
- абмежаваннямі на правядзенне сходаў, у прыватнасці патрабаваннямі праводзіць іх выключна ў дазволеных месцах, абмежаваннямі па колькасці ўдзельнікаў (колькасць удзельнікаў мерапрыемстваў, якія арганізуюцца фізічнымі асобамі, павінна быць менш за 1 000 чалавек) і забаронай стыхійных сходаў.

У гэтай сувязі Камітэт рэкамендаваў Рэспубліцы Беларусь перагледзець законы, падзаконныя акты і практыку, у тым ліку Закон «Аб масавых мерапрыемствах», каб гарантаваць магчымасць карыстання ў поўнай меры правам на свабоду сходаў як у заканадаўстве, так і на практыцы, і забяспечыць, каб любыя абмежаванні на свабоду сходаў, у тым ліку шляхам прымянення адміністрацыйных і крымінальных пакаранняў да асоб, якія рэалізуюць гэта права, адпавядалі строгім патрабаванням артыкула 21 Пакта.[1]

1 CCPR/C/BLR/CO/5, para. 53.




# Мірныя сходы ў 2019 годзе

***Гэты разьдзел прадстаўляе дадзеныя па колькасці мірных сходаў, праведзеных у 2019 годзе, іх асноўных характарыстыках, месяцах правядзення і тэматычнага накірунку. Таксама з мэтай выяўлення асноўных змяненняў па колькасці, месяцам правядзення і тэматыцы мірных сходаў ў разьдзеле праводзіцца параўнанне дадзеных мінулых гадоў з 2019 годам. Дадзеныя для гэтага разьдзелу мы збіралі з дапамогай незалежнага маніторынгу публічных крыніц (інфармацыя ў СМІ і сацыяльных сетках), наведвання 21 мірнага сходу, а таксама па паведамленнях непасрэдна ад саміх людзей або ў выніку звароту ў праваабарончыя арганізацыі.***

## Колькасць мірных сходаў у 2019 годзе

Нам вядома пра 127 мірных акцый, якія адбыліся ў Беларусі на працягу 2019 года (графік 1), у тым ліку: 9 пікетаў, праведзеных у перыяд з 8 верасня па 7 кастрычніка падчас збору подпісаў за кандыдатаў у дэпутаты Парламенту. Актывісты часта сумяшчалі дзейнасць па збору подпісаў з правядзеннем іншых пікетаў па значных пытаннях. З 7 кастрычніка па 17 лістапада праходзіла мноства сходаў у рамках перадвыбарнай кампаніі дэпутатаў у Парламент, якія па форме і тэмах былі падобныя на рэгулярныя акцыі, аднак мы разгледзім іх у асобным разьдзеле.




**Графік 1: Колькасць масавых мерапрыемстваў па месяцах 2019 года**

Варта адзначыць, што агульная колькасць акцый у 2019 годзе перавышае колькасць акцый, зафіксаваных намі раней. Такім чынам, у 2016 годзе было зафіксавана 58 акцый, у 2017 годзе іх было 65, а у 2018 годзе – 81 акцыя (графік 2).[2]

2 http://ecnl.org/wp-content/uploads/2017/12/ECNL-FoPA-Belarus-2017.pdf
http://ecnl.org/wp-content/uploads/2019/01/Belarus-Assembly-Report-2018.pdf

Высокая актыўнасць у сакавіку звязана са святкаваннем Дня Волі і абвастрэннем экалагічных праблемаў у Брэсце, Светлагорску і Гомелі.




**Графік 2: Агульная штогадовая колькасць масавых мерапрыемстваў у 2016 - 2019 гг.**

у жніўні кампанія ProtestBy правяла серыю пікетаў па прынцыпе паведамлення; а ў снежні было праведзена 11 акцый пратэсту супраць інтэграцыі з Расеяй. Іншыя сустрэчы ўключалі распаўсюджванне спецыяльных выпускаў газеты «Народная воля» з вынікамі маніторынгу праваабаронцамі передвыбарнай кампаніі дэпутатаў у Парламент: у лістападзе адбылося 6 акцый і яшчэ 1 адбылася ў снежні. Таксама ў снежні, ў 13 гарадах Беларусі было праведзена 13 акцый, прысведчаных Дню правоў чалавека.

На працягу 2019 года праз рашэнне уладаў было перапынена або адменена як мінімум 4 мірных сходу:

1 13 студзеня 2019 года, ўлады забаранілі акцыю супраць будаўніцтва акумулятарнага завода ў Брэсце праз правядзенне "запланаваных спартыўных мерапрыемстваў." Заява на правядзенне сходу была падана па прынцыпе паведамлення. Сход павінен быў адбыцца ў парку Воінаў-інтэрнацыяналістаў, які ўнесены ў спіс месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў. Актывісты вырашылі правесьці сход нягледзячы на адсутнасць дазволу і рызыкі накладання адміністрацыйных спагнанняў.

2 22 жніўня 2019 года, актывіты не змаглі арганізаваць пікет супраць новага закону аб ваеннай службе ў запланаваны дзень праз зацягванне заключэння дагавору на ўборку тэрыторыі.[3] Пікет адбыўся на дзень пазней.

3 9 снежня 2019 года, ініцыятыва "Маршыруй, дзетка" планавала правядзенне пікету супраць гендэрнага гвалту ў Мінску. Нягледзячы на тое, што правядзенне пікету было запланавана ў пастаянным месцы правядзення масавых мерапрыемстваў, заява была адхіленая з прычыны правядзення ў гэты час работ па акультурванні тэрыторыі.[4] Актывісты вырашылі правесці несанкцыянаваны сход 10 сьнежня[5] і перанесці іншыя сходы на пазнейшыя даты (28-29 снежня).

4 27 снежня 2019 года, сход кампаніі "Свежы Вецер" быў перапынены міліцыяй. Актывісты запрашалі грамадзян у будынак пошты ў Мінску, каб падпісаць зварот да ўладаў супраць інтэграцыі з Расеяй. Аднак яшчж да пачатку акцыі, будынак напоўнілі супрацоўнікі міліцыі ў цывільным – актывісты былі вымушаныя адмяніць сход.

3 https://euroradio.fm/ru/mezhvedomstvennyy-futbol-kak-chinovniki-studenta-s-piketom-tuda-syuda-posylali

4 https://spring96.org/ru/news/95409

5 https://kyky.org/news/zadushena-golymi-rukami-ottsa-v-minske-ustroili-art-installyatsiyu-o-zhertvah-domashnego-nasiliya

## Уплыў змен у заканадаўстве

Змены ў заканадаўстве па працэдуры правядзення масавых мерапрыемстваў не павялічылі грамадзянскую актыўнасць і выкарыстанне права на свабоду мірных сходаў. Паводле нашай інфармацыі, 12 сходаў 2019 года адбыліся ў адпавесці з новай працэдурай: 11 ў Мінску і 1 ў Магілёве; яшчэ 4 сходы былі праведзеныя праз атрыманне спецыяльнага дазволу, у тым ліку сходы ў Мінску і Горадне на Дзень Волі – 24 сакавіка; а таксама 2 сходы празначаных памяці рэпрасаваных, якія адбыліся 3 і 10 ліспапада ў Мінску.




**Графік 3: Прававы статус масавых мерапрыемстваў ў 2019 годзе**

Паводле графіка 3, толькі 20% ад агульнай колькасці сходаў можна аднесці да санкцыянаваных: 13% сходаў былі праведзены па новай працэдуры паведамлення і яшчэ 7% ў рамках передвыбарнай кампаніі.

Адметна, што 102 з 127 масавых мерапрыемстваў былі арганізаваны без запыту спецыяльнага дазволу або падачы паведамлення, такім чынам, згодна Беларускаму заканадаўству лічацца “несанкцыянаванымі.”

У некалькіх выпадках, прадстаўнікі апазіцыі не апавясцілі выканаўчы камітэт аб намеры правесці мірны сход (напрыклад, сход у Мінску 20 снежня 2019 года). Нягледзячы на тое, што нават гэтыя крокі не гарантуюць “легалізацыю” сходаў, іх удзельнікі былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за “удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве”.

## Месцы правядзення масавых мерапрыемстваў

Геаграфічна, сходы ў 2019 годзе адбыліся ў 17 гарадах Беларусі. Больш за ўсё акцый прайшло ў Мінску - 51, на другім месцы Брэст - 43 мерапрыемствы.

У адрозненне ад 2016 і 2018 гадоў, калі сходы адбываліся толькі ў 4 гарадах Беларусі, геаграфічнае пакрыццё масавых мерапрыемстваў 2019 года значна павялічылася і амаль дасягнула ўзроўню 2017 года, калі мерапрыемствы праводзіліся ў 19 гарадах (графік 5). У 2019 годзе сходы адбыліся таксама і ў новых для гэтага гарадах: Добруш, Ліда, Смаргонь.




**Графік 4: Месцы правядзення масавых мерапрыемстваў ў 2019 годзе**




**Графік 5: Колькасць гарадоў, дзе адбываліся масавыя мерапрыемствы ў 2016 - 2019 гг.**

У 2019 годзе ў Мінску былі праведзены 4 традыцыйных штогадовых шэсця з мітынгамі (на Дзень Волі, “Чарнобыльскі Шлях” і двойчы на «Дзяды»). Таксама, пачынаючы з 10 лютага, кожную нядзелю ў Брэсце праводзіліся акцыі з шэсцямі супраць будаўніцтва акумулятарнага завода (раней былі толькі пікеты на плошчы).




**Графік 6: Адсоткавыя суадносіны розных відаў сходаў у 2017 - 2019 гг.**

## Тэматыка сходаў

Прынцыпова новым у статыстыцы, у параўнанні з мінулымі гадамі, стала рэзкае павелічэнне прысутнасці экалагічнай тэматыкі. З 81 зарэгістраванага мерапрыемства, якія




**Графік 7: Тэматычны накірунак масавых мерапрыемстваў у 2017 - 2019 гг.**

былі зарэгістраваныя ў 2018 годзе, 48 закраналі экалагічныя пытанні, а ў 2019 годзе колькасць такіх мерапрыемстваў дасягнула 50 з 127 акцый. У той жа час, у 2017 годзе толькі 1 акцыя закранала пытанні навакольнага асяроддзя (графік 7). Асноўная частка мерапрыемстваў праходзіла ў Брэсце ў сувязі з пратэстамі супраць запуску акумулятарнага завода. Адметна, што сходы працягваліся нягледзячы на тое, што гарадскія ўлады паабяцалі не запускаць завод у эксплуатацыю.[6]

6 http://greenbelarus.info/articles/11-06-2019/brestskiy-zavod-akb-snova-ne-prinyali-v-ekspluataciyu

Таксама па 2 падобных акцыі прайшлі ў Светлагорску[7] і Гомеле[8]. У Мінску экалагічныя акцыі праходзілі ў форме невялікіх пікетаў супраць забудовы[9] або ў рамках «кліматычнага страйка».[10]

Экалагічныя пратэсты аказалі ўплыў на уладаў толькі ў Брэсце. У выніку

7 https://www.facebook.com/permalink.php?story_fbid=788740748172900&id=100011109460468

8 https://gomel.today/rus/news/gomel-11918/ and https://news.tut.by/society/628439.html

9 http://greenbelarus.info/articles/05-03-2019/fota-fakt-lyudzi-vyyshli-z-piketam-suprac-budaunictva-bi-znas-centra-u-svaih?fbclid=IwAR2rpE77ljtMMi3dI6y-BI3PRyvwx0PZuqE5MfUoal3uYbty4uGI0OIGV6VA

10 https://www.svaboda.org/a/30187272.html and https://www.svaboda.org/a/30187553.html

маштабнай кампаніі, уключаючы сходы ў цэнтры горада, завод не быў запушчаны ў эксплуатацыю як было запланавана раней. Характэрна, што Прэзідэнт заявіў, што ён "на баку народа." У канцы 2019 года, улады абвясцілі аб дадатковай экалагічнай інспекцыі завода.

У 2019 годзе, упершыню за 30 гадоў, у Беларусі не змаглі атрымаць дазвол на правядзенне акцыі «Чарнобыльскі Шлях» - у адрозненне ад мінулых гадоў, яна прайшла ў малалюдным і недазволеным фармаце. Арганізатары атрымалі дазвол на правядзенне дадзенай акцыі, але адклікалі заяву за некалькі дзён да запланаванай даты правядзеньня маршу праз недастатковае фінансаванне для пакрыцця выдаткаў на міліцыю, медыцынскія і камунальныя паслугі.[11]

Другое па колькасці акцый месца займае тэма прасоўвання правоў чалавека. Такія акцыі праводзіліся ў розных гарадах Беларусі пераважна ў фармаце распаўсюджвання газет актывістамі праваабарончага цэнтра "Вясна".

Таксама актывісты абароны правоў чалавека арганізавалі 2 акцыі ў выглядзе «манстрацый» па працэдуры паведамлення, яны былі праведзены ў Мінску і ў Магілёве. На манстрацыях актывісты выкарыстоўвалі абсурдныя лозунгі, каб прыцягнуць увагу як уладаў, так і грамадзян да праблемы рэалізацыі права на свабоду мірных сходаў у Беларусі.

Скарацілася колькасць акцый памяці і мерапрыемстваў у Курапатах, але з'явіліся новыя тэмы. Напрыклад, змяненне ў заканадаўстве аб адмене адтэрміновак ад вайсковай службы для студэнтаў. Пры гэтым удзельнікі кампаніі супраць гэтых змяненняў правялі 4 пікеты ў паведамляльным парадку ў дазволеных для гэтага месцах, але з-за недастатковага фінансавання адмовіліся ад такіх практык і былі вымушаныя рэгістравацца ў якасці кандыдатаў у дэпутаты ў парламент, каб была магчымасць правядзення акцый на гэтую тэму бясплатна.

Таксама працягваліся акцыі па праблеме празмерна строгага пераследу за захоўванне і распаўсюджванне наркатычных рэчываў і з патрабаваннямі ўвядзення асобнага закона супраць хатняга гвалту. Гэтыя сходы праводзіліся ў некалькіх гарадах, але пераважна у Мінску.

## Колькасць удзельнікаў сходаў

У 57 мерапрыемствах колькасць удзельнікаў не перавысіла 10 чалавек. Сярод іншага, гэта было абумоўлена абмежаваннямі, устаноўленымі ўрадам. Так, празмерна высокі кошт паслуг міліцыі, а таксама медыцынскіх і камунальных паслуг, рызыка адміністрацыйнай адказнасці ў выніку нават найменьшага адхілення ад прадпісанай колькасці ўдзельнікаў.

Толькі 3 сходы ўключалі больш за 1000 удзельнікаў: сход на Дзень Волі 24 сакавіка - 1300 удзельнікаў у Мінску і 4000 у Гародне. Аднак гэта ў большай ступені абумоўлена правядзеннем канцэрта, на якое прыехалі людзі з усёй краіны. Трэцім масавым сходам стала дэманстрацыя супраць інтэграцыі з Расеяй, якая адбылася 20 снежня ў Мінску і сабрала 1600 удзельнікаў.[12]

11 https://naviny.by/article/20190426/1556300808-nelzya-za-pretit-byt-lyudmi-kak-proshel-chernobylskiy-shlyah-2019

12 https://www.svaboda.org/a/30336577.html

## Апытанне арганізатараў сходаў

Для поўнага разумення ўплыву змен ў заканадаўстве на карыстанне правам на свабоду мірных сходаў, мы апыталі актыўных грамадзян, якія спрабавалі альбо правялі масавыя мерапрыемствы ў 2019 годзе. Анкеты распаўсюджваліся праз рассылання і асабістыя паведамленні. Мы атрымалі 17 адказаў.

У адказах апісваюцца акцыі, якія ўжо прайшлі або толькі плануюцца. Некалькі анкет апісваюць сходы, якія прайшлі ў рамках выбарчага заканадаўства па спрошчанай працэдуры.

16 з 17 рэспандэнтаў ўжо мелі вопыт арганізацыі або спрабавалі арганізаваць сходы раней: 11 з іх займаліся арганізацыяй сходаў у Мінску, астатнія прадстаўлялі такія гарады як Магілёў, Мазыр, Светлагорск, Слуцк і Віцебск. Аднак толькі палова з 17 рэспандэнтаў мелі поспех ў арганізацыі сходу, 4 атрымалі частковы поспех і 4 не атрымалі поспех у арганізацыі зусім (графік 8).




**Графік 8: Поспех рэспандэнтаў у арганізацыі мірных сходаў**

У 12 выпадках арганізатары адправілі запыт у мясцовыя выканаўчыя камітэты: у 9 выпадках была выкарыстаная паведамляльны сістэма, у 3 выпадках была прыцягнута дазвольная сістэма. Усе запыты былі адмоўлены.

У 10 выпадках рэспандэнты сцвярджаюць, што яны не адчуваюць рэальных пераменаў у працэдуры арганізацыі грамадскіх сходаў: некаторыя заяўляюць, што ў арганізацыі сходу было адмоўлена гэтак жа, як гэта адбывалася раней, а ў астатніх выпадках супраць удзельнікаў былі ўжытыя адміністрацыйныя меры.

У той жа час, іншыя рэспандэнты лічаць, што новаўвядзенні ўскладнілі працэс арганізацыі грамадскіх сходаў. У 6 выпадках арганізатарам прыйшлося звярнуцца па прававую дапамогу для падрыхтоўкі поўнага камплекта дакументаў.

Вопыт і погляды тых, хто арганізоўваў або спрабаваў арганізаваць мірны сход, могуць быць праілюстраваны ў наступных цытатах (усе з якіх выкарыстаныя з дазволам рэспандэнтаў):

**«Ты не можаш зрабіць абсалютна нічога. Можаш бясконца пісаць запыты на арганізацыю дэманстрацыі. Месцы для правядзення сходаў - безжыццёвыя паркі, дзе нікога няма, і ты стаіш на пікеце ў гразі (я тая, хто ўдзельнічаў у сакавіцкай дэманстрацыі з «Вясной»), правядзенне дэманстрацый жудасна дарагое, і, што злуе больш за ўсё, выканаўчы камітэт адмаўляецца абмяркоўваць і кансультаваць па правядзенні дэманстрацый. Яны кажуць, што не абавязаныя рабіць гэта. Вы ня можаце рабіць аб›яву аб мерапрыемстве перш, чым атрымаеце дазвол».**

**«Занадта складаная працэдура санкцыянавання. Я абсалютна ня згодны/а са спагнаннем платы за такія мерапрыемствы ».**

**«Яны надаюць ўвагу падзеям для грамадскай забавы, яны заўсёды спаганяюць плату за падтрыманне грамадскага парадку і медыцынскія паслугі, гэта шалёныя грошы за бясплатныя мерапрыемствы».**

**«Кіраўнік рэгіянальнага дэпартамента ўнутраных спраў ня ведае як ажыццяўляецца аплата і як заключаецца кантракт для пікета ці іншага мерапрыемства».**

**«Правядзенне санкцыянаванай дэманстрацыі ўсё такое ж: складанае, амаль немагчымае, калі яна не праходзіць у межах перадвыбарчай кампаніі».**

**«Я не бачу рэальных зменаў. Я магу нават сказаць, што стала горш, таму што раней была магчымасць праводзіць хоць нейкія дэманстрацыі (напрыклад, Чарнобыльскі Шлях) бясплатна; сэнс быў у дазволе ад выканаўчага камітэта. Час ад часу атрымлівалася атрымаць дазвол. Але цяпер трэба плаціць за правядзенне дэманстрацый, кожны выпадак сканчаецца парушэннем закона. Такім чынам, я думаю, улады сапраўды пагоршылі магчымасці на рэалізацыю правоў грамадзян на свабоду мірных сходаў».**

Толькі 1 чалавек зрабіў пазітыўны каментар, але нават ён ставіцца да іншых працэдураў правядзення масавых мерапрыемстваў: “Я адчуў, што правесці мірны сход магчыма ў перыяд “лібералізацыі”, калі ў Беларусі праводзяцца Еўрапейскія Гульні ці выбары’.

Як паказваюць вынікі апытання, на практыцы папраўкі да закона аб мірных сходах не прынеслі рэальных пазітыўных змяненняў у працэдуры арганізацыі грамадскіх мерапрыемстваў.

Замест гэтага, арганізатары мірных сходаў сутыкнуліся з вялікай колькасцю выклікаў, уключаючы складанасць і незразумеласць заканадаўства; бюракратыю фармальных працэдур; непасьлядоўнасьць у інтэрпрэтацыі прававых патрабаванняў; ціск з боку ўладаў, уключаючы пагрозы і шантаж падчас арганізацыі сходаў; а таксама высокі кошт абавязковых для арганізацыі мірных сходаў паслуг.

На пытанне: “Якія змены ў працэдуры грамадскіх мерапрыемстваў вы б хацелі бачыць?” - амаль усе рэспандэнты пагадзіліся, што неабходна адклікаць патрабаванне аплаты дзяржаўных паслуг і ўвесці паведамляльны прынцып правядзення для ўсіх тыпаў грамадскіх мерапрыемстваў. Адны рэспандэнты прапанавалі перагледзець закон аб масавых мерапрыемствах, у той час як іншыя выступілі за магчымасць абмеркавання з выканаўчым камітэтам часу і месца правядзення сходаў. Таксама ўздымалася пытанне аб падтрыманні грамадскага парадку на сходах і, у прыватнасці, аб прысутнасці афіцэраў у цывільным, якія адмаўляюцца прадастаўляць любую афіцыйную інфармацыю па запыце.



# Права на свабоду сходаў дзяцей і падлеткаў

Права на свабоду мірных сходаў гарантавана дзецям і падлеткам ва ўзросце да 18 гадоў, у адпаведнасці з артыкулам 15 Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці (1989)[13], падпісантам якой з'яўляецца і Беларусь.

Тым не менш, інфармаванне аб грамадзянскіх і палітычныя правах дзяцей у Беларусі развіта слаба. Напрыклад, дзіцячы прававы сайт http://mir.pravo.by/ не ўтрымлівае інфармацыю аб праве на свабоду сходаў ці практычных рэкамендацый на гэтую тэму. Акрамя таго, тэкст закона "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" не з'яўляецца агульнадаступным.

Ніжэй апісаны 2 выпадкі, звязаныя з парушэннямі права на свабоду сходаў і пераслед з боку ўладаў у дачыненні да непаўналетніх за рэалізацыю іх права на мірны сход.

13 https://www.ohchr.org/en/professionalinterest/pages/crc.aspx

1 16 кастрычніка 2018 года непаўнагадовы актывіст апазіцыйнай палітычнай партыі Арсеній Дзядок прымаў удзел у мірным сходзе супраць дзедаўшчыны ў беларускім войску. Пікет быў спынены супрацоўнікамі праваахоўных органаў амаль адразу пасля пачатку, а ўдзельнікі былі затрыманыя ў да суда. Арсеній Дзядок, будучы непаўналетнім, быў вызвалены ў той жа дзень, у той час як два іншых ўдзельнікі былі аштрафаваныя судом на наступны дзень. У лістападзе 2019 года актывіст прымаў удзел у перадвыбарчых агітацыйных пікетах, якія былі праведзены ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам. У студзені 2020 года Арсеній разам з бацькам былі выкліканыя на пасяджэнні Камісіі па справах непаўналетніх. Арсенію было вынесена папярэджанне, што з'яўляецца хоць і фармальным пакараннем, але пры гэтым парушэннем правоў актывіста.

2 15-ці гадовы актывіст "Маладога фронту" Іларыён Трусаў з'яўляецца актыўным удзельнікам пратэстаў

ва ўрочышчы Курапаты каля Мінска (месца масавых расстрэлаў у 1930-х гадах). 03.07.19 і 03.11.19 ён быў затрыманы супрацоўнікамі праваахоўных органаў з ужываннем фізічнай сілы разам з іншымі прысутнымі за ўдзел у мірным сходзе. І. Трусаў і яго маці (як законны прадстаўнік непаўнагадовага) падвяргаюцца пастаяннаму праследу за рэалізацыю свабоды выказвання меркавання, у тым ліку ў выглядзе пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях і пагроз прымусовага памяшкання ў закрытую спецыялізаваную навучальную ўстанову.[14]

14 http://spring96.org/en/news/91127




# Рэалізацыя свабоды сходаў у выбарчы перыяд

17 лістапада 2019 года ў Беларусі прайшлі выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га склікання. Шляхам прамога галасавання было абрана 110 дэпутатаў у 110 выбарчых акругах. На працягу двух этапаў выбарчай кампаніі (збор подпісаў за вылучэнне ў кандыдаты ў дэпутаты і агітацыя) праходзяць мірныя сходы. Правядзенне падобных сходаў рэгулюецца Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь (артыкул 45), а не законам "Аб масавых мерапрыемствах.

Згодна з артыкулам 65 ВК, адным са спосабаў вылучэння кандыдатаў у дэпутаты з'яўляецца збор подпісаў выбаршчыкаў. Збор подпісаў праходзіць у форме пікетаў і ажыццяўляецца ініцыятыўнай групай колькасцю не менш за 10 чалавек. Месцы для збору подпісаў вызначаюцца рашэннямі органаў мясцовай выканаўчай улады. Фактычна, улады прынялі рашэнні ў якіх вызначылі месцы, забароненыя для правядзення пікетаў па зборы подпісаў. І, адпаведна, усе астатнія месцы даступны для правядзення сходаў. Колькасць забароненых месцаў невялікае і практычна адпавядае месцам падчас папярэдняй выбарчай кампаніі. Звычайна пікеты па зборы подпісаў праходзілі ў спакойнай абстаноўцы, без перашкод з боку ўладаў .[15]

Месцы для агітацыі таксама вызначаліся мясцовымі выканаўчымі камітэтамі. Мірныя сходы ў дазволеных месцах праводзіліся ў паведамляльным парадку, самімі кандадатамі у дэпутаты або іх даверанымі асобамі. Для арганізацыі масавых мерапрыемстваў кандыдаты ў дэпутаты і давераныя асобы кандыдатаў накіроўваюць апавяшчэнне ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган не пазней, чым за два дні да запланаванай даты правядзення мерапрыемства. Парадак вядзення передвыбарнай агітацыі рэгулюецца Выбарчым кодэксам і пастановамі Цэнтральнай выбарчай камісіі. Забараняецца агітацыя, якая змяшчае наступныя пункты:

- прапаганда вайны,
- заклікі да гвалтоўнай змены

15 http://elections2019.spring96.org/en/news/94570

канстытуцыйнага ладу,

- абразы і паклёп у дачыненні да службовых асобаў Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у дэпутаты,
- заклікі, якія падахвочваюць або якія маюць на мэце заахвочваньне да зрыву або адмене, або пераносу тэрміну выбараў, назначаных у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

У некаторых выбарчых акругах колькасць месцаў для агітацыі павялічылася нават у параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Таксама, як і раней месцы для агітацыі з'яўляюцца зручнымі. У большасці выбарчых акругаў рашэннямі выканкамаў месцамі для агітацыйных масавых мерапрыемстваў былі вызначаны любыя прыдатныя для гэтых мэтаў месцы, за выключэннем некаторых абмежаванняў. У некаторых буйных гарадах, у тым ліку і ў г. Мінску, з ліку месцаў, прыдатных для правядзення масавых мерапрыемстваў, былі выключаныя цэнтральныя плошчы. Пры гэтым дадзеныя абмежаванні нічым не былі абгрунтаваныя.[16]

Магчымасці для правядзення мірных сходаў у спрошчаным парадку актыўна выкарыстоўваліся палітычнымі сіламі і грамадзянскімі ініцыятывамі для прасоўвання сваіх інтарэсаў.

Сярод цікавых выпадкаў падчас выбарчай кампаніі неабходна адзначыць:

**16 верасня ў цэнтры Мінска прайшоў аб'яднаны пікет 4 чалавек, якія збіралі подпісы за вылучэнне ў кандыдаты ў дэпутаты. Асноўнай тэмай пікету была 20-я гадавіна знікнення апазіцыйных палітыкаў, выкарыстоўваліся плакаты на гэтую тэму і партрэты зьніклых. Акруговая избиартельная камісія вынесла папярэджанне Мікалаю Казлову за парушэнне парадка правядзення агітацыі.[17]**

**8 лістапада 2019 на пл. Свабоды ў Менску прайшоў самы шматлікі мірны сход у рамках выбарчага перыяду. Паводле ацэнак назіральнікаў, у сходзе прыняло ўдзел больш за 500 чалавек. Мерапрыемства было анансавана блогерам NEXTA, які пражывае ў Польшчы. Супрацоўнікі міліцыі ў цывільным адзенні не далі скарыстацца прысутным гукаўзмацняльнай апаратурай, зламаўшы яе. Падчас мерапрыемства была затрымана здымачная група нямецкіх журналістаў і праз 2,5 гадзіны вызваленая з Цэнтральнага РУУС г.[18]**

16 http://elections2019.spring96.org/ru/news/95083

17 https://www.racyja.com/palityka/mikalayu-kazlovu-vynese-na-papyaredzhan/

18 http://elections2019.spring96.org/en/news/94888



# Адміністратыўны пераслед за рэалізацыю свабоды мірных сходаў і выказвання меркавання

Асноўнай формай пакарання на ўдзел у несанкцыянаваным уладамі мірным сходзе альбо за заклікі да ўдзелу з'яўляецца буйны грашовы штраф (каля 550 еўра) альбо адміністрацыйны арышт да 15 сутак.

У 2019 годзе ў артыкуле 23.34 КаАП (парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах) вынесена не менш 162 судовых пастаноў у дачыненні да 121 чалавека. З іх прызначаны арышт у 13 зафіксаваных выпадках.

Акрамя таго, выкарыстоўваюцца і іншыя артыкулы Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія прымяняюцца для пакарання за ўдзел у мірных сходах і за выказванне меркаванняў на вулічных акцыях:

**23.4 КаАП - непадпарадкаванне законнаму патрабаванню службовай асобы, да адказнасці прыцягнута 3 чалавекі;**

**17.1 ("дробнае хуліганства"), да адказнасці прыцягнута 16 чалавек (25 зафіксаваных выпадкаў, большая частка з якіх кваліфікавана адначасова і па арт. 23.4 КаАП).**

**11 чалавек (у 44 выпадках) аштрафаваныя за парушэнне правілаў дарожнага руху. Гэтыя выпадкі звязаныя з пратэстамі ва ўрочышчы Курапаты.**

Такім чынам, за ажыццяўленне права на мірныя сходы, свабоду меркаванняў і яго выказвання на вулічных акцыях падвергнуты адміністрацыйным спагнанням не менш 151 чалавека, зафіксавана не менш 234 выпадкі рэпрэсій за 2019 год.

У папярэднія гады сітуацыя з адміністрацыйным пераследам выглядала наступным чынам:

У 2018 годзе – у працягу года зафіксавана 184 выпадкаў прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці за ўдзел у несанкцыянаваных мірных сходах у дачыненні да 144 чалавек: арышты прызначаліся 21 раз, штрафы былі вынесеныя ў 163 выпадках на агульную суму каля 45 000 еўра.

На працягу 2017 года зафіксавана больш за 600 выпадкаў прыцягнення людзей да адміністрацыйнай адказнасці ў сувязі з рэалізацыяй свабоды мірных сходаў і выказвання меркавання, у больш

чым 250 выпадках суддзі прызначалі адміністрацыйны арышт.

У 2017 годзе зафіксаваны рост пратэстных рухаў, у сувязі з прыняццем Дэкрэта №3 аб сацыяльным ўтрыманстве. Шмат акцый пратэсту прайшлі ў пачатку 2017 года. 15 і 25 сакавіка ўлады жорстка разагналі мірныя сходы, у цэнтры Мінска былі затрыманыя сотні чалавек.

2018 год характарызаваўся больш спакойнай становішчам і больш нізкім узроўнем рэпрэсій, і ў выніку зафіксавана менш выпадку ў параўнанні з 2018 і 2019 гадамі.

У снежні 2019 года значна ўзмацніліся рэпрэсіі супраць удзельнікаў мірных сходаў, што адбыліся ў час парламенцкіх выбараў. А таксама ўдзельнікаў серыі мірных акцый пратэсту супраць падпісання пагадненняў аб паглыбленай інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй. Усяго за снежань прызначанае не менш за 70 адміністрацыйных штрафаў за ўдзел у мірным пратэсьце альбо за заклікі да ўдзелу. 12 чалавек былі арыштаваны на тэрмін ад 5 да 15 дзён.

Варта адзначыць, што несанкцыянаваныя мітынгі ў падтрымку незалежнасці не былі прымусова спыненыя паліцыяй, іх ўдзельнікі не затрымліваліся ні падчас саміх мітынгаў, ні адразу пасля іх завяршэння.

Сітуацыя, якая склалася наглядна дэманструе адсутнасць сістэмных зменаў, як у цэлым з правамі чалавека, так і канкрэтна ў сферы свабоды сходаў. Магчымасці для падаўлення пратэстаў ва ўладаў вельмі шырокія і рэгулярна выкарыстоўваюцца уладай пры неабходнасці.

Дадзеныя аб адміністратыўных перасьледзе ўзятыя з базы адміністрацыйнага пераследу Праваабарончага цэнтра “Вясна”.[19]

19 https://spring96.org/persecution




# Маніторынг мірных сходаў

З 2012 года Беларускі Хельсінкскі Камітэт і Праваабарончы цэнтр “Вясна” праводзяць сістэматычнае назіранне за мірнымі сходамі ў Беларусі на падставе распрацаванай метадалогіі маніторынгу. Гэтая метадалогія ўключае ў сябе:

- набор і навучанне назіральнікаў і назіральніц прынцыпам грамадскага кантролю, міжнародным стандартам правядзення мірных сходаў і метадалогіі назірання;
- запаўненне анкеты назірання падчас вочнага кантролю;
- апрацоўка анкет і напісанне маніторынгавай справаздачы.

праваабарончымі арганізацыямі і ўключаюць пытанні аб магчымасці выканання назіральнікамі і журналістамі сваіх функцый, аб паводзінах арганізатараў і ўдзельнікаў мірнага сходу, супрацоўнікаў праваахоўных органаў, а таксама наяўнасць на мірным сходзе хуткай дапамогі і медыцынскіх работнікаў. Назіральнікі і назіральніцы дапускаюцца да назірання толькі ў выпадку згоды на захаванне правілаў працы ў камандзе і прынцыпаў назірання. Прынцыпы назірання апісаны ў Кодэксе паводзін і ўключаю наступныя пункты:

- незалежнасць і палітычная нейтральнасць;
- апісанне фактаў, а не меркаванняў;
- неўмяшанне ў падзею, за якой назіраюць;
- прыхільнасць да прынцыпаў права;
- адмова ад любых формаў гвалтоўных дзеянняў і дыскрымінацыйных практык;
- карэктныя паводзіны.

Падчас выканання сваіх абавязкаў назіральнікі па магчымасці трымаюцца асобна ад удзельнікаў. Яны пазначаныя пасведчаннямі і сінімі камізэлькамі з надпісам “# ControlBY”.

Маніторынгавыя справаздачы размяшчаюцца ў вольным доступе для ўсіх зацікаўленых асобаў:

- https://spring96.org/be/civilian-control
- https://spring96.org/ru/civilian-control
- https://spring96.org/en/civilian-control

Незалежны маніторынг публічных сходаў з’яўляецца надзвычай важнай крыніцай незалежнай інфармацыі аб

паводзінах як арганізатараў і ўдзельнікаў сходу, так і супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Гэтая інфармацыя павінна быць выкарыстана ў ходзе грамадскай дыскусіі і паслужыць асновай для дыялогу паміж урадам, мясцовымі органамі ўлады, праваахоўнымі органамі і грамадзянскай супольнасцю (згодна з пунктам 5.9 кіруючых Прынцыпаў па свабодзе мірных сходаў: выданне 2-е, 2010 г., падрыхтавана саветам экспертаў БДІПЧ АБСЕ па пытаннях свабоды сходаў і Еўрапейскай камісіяй за дэмакратыю праз права Савета Еўропы).

Мэтай дадзенага маніторынгу з'яўляецца прадастаўленне зацікаўленым дзяржаўным органам і грамадскасці аб'ектыўнай ацэнкі ходу правядзення масавага мерапрыемства з тым, каб палепшыць практыку правядзення масавых мерапрыемстваў як з боку арганізатараў і ўдзельнікаў, так і з боку органаў аховы правапарадку.

За 2019 год быў праведзены маніторынг 21 мірнага сходу. Большая частка з іх прайшла ў Мінску, а таксама 2 у Брэсце.

Адной з пастаянных рэкамендацый супрацоўнікам праваахоўных органаў з'яўляецца наступная:

**"ажыццяўляць ахову грамадскага парадку падчас мірных сходаў у форменнай вопратцы, а таксама быць пазначанымі індывідуальнымі ідэнтыфікацыйнымі сродкамі (напрыклад, бэйджамі або нагруднымі знакамі)".**

Дадзеная рэкамендацыя заснавана на пункце 153 Кіруючых прынцыпаў па свабодзе мірных сходаў, у адпаведнасьці з якім

**"Неабходна, каб супрацоўнікаў паліцыі было лёгка адрозніць (у тым ліку па асабістых апазнавальных знаках).**

Форменнае адзенне супрацоўнікаў міліцыі вельмі важнае, для таго каб усе ўдзельнікі сходаў мелі разуменне выконваемых імі функцый, мелі магчымасць бесперашкодна звярнуцца да супрацоўнікаў пры ўзнікненні такой неабходнасці, каб супрацоўнікі візуальна не зліваліся з натоўпам і іх было лёгка ідэнтыфікаваць. Для назіральнікаў таксама важна адрозніваць супрацоўнікаў міліцыі для таго, каб пры неабходнасці выконваць функцыю медыятараў. Прысутнасць супрацоўнікаў у форменнай вопратцы выклікае ва ўдзельнікаў сходу і астатніх людзей пачуццё абароненасці, павагі да супрацоўнікаў міліцыі, разуменне іх аўтарытэту, а таксама спрыяе антыдэвіянтным паводзінам. Пры правядзенні назіранняў адзначана, што ўсе адміністрацыйныя і рэгулюючыя функцыі выконваюць супрацоўнікі ў грамадзянскай форме адзення. Напрыклад, раздаюць ўказанні з дапамогай рацый і кіруюць дзеяннямі супрацоўнікаў міліцыі ў спецформе і грамадзянскай форме адзення.

Дзеючае нацыянальнае заканадаўства дапускае нашэнне цывільнага адзення ў службовае час асобамі, якім ва ўстаноўленым парадку гэта дазволена. Згодна з пунктам 30 Загаду Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад 4 сакавіка 2013 г. № 67 "Аб зацвярджэнні Правілаў прафесійнай этыкі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь" у выпадку нашэння цывільнай формы адзення пры выкананні службовых абавязкаў супрацоўнік павінен прытрымлівацца

дзелавога стылю адзення. Па нашых назіраннях дадзенае правіла рэгулярна парушаецца. Больш за тое, намі былі зафіксаваныя зусім непрымальныя выпадкі пагарды дадзенага правіла, напрыклад, калі 3 супрацоўніка праваахоўных органаў знаходзіліся на месцы правядзення мірнага сходу ў куртках з лагатыпам грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» 8 лістапада 2019 года ў Мінску.

У тых выпадках, калі мірны сход мае выгляд або элементы шэсця, назіральнікі фіксуюць разрыў калоны людзей на святлафорах і пешаходных пераходах. Звычайна рэгулюючую функцыю выконваюць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі ў спец форме. Рэкамендацыя складаецца ў тым, каб

**"забяспечваць бесперашкодны рух калоны на пешаходных пераходах, арганізоўваць рух калоны з улікам прынцыпу інклюзіўнасці (калі магчыма, выключыць лесвіцы, падземныя пераходы, павышэння бардзюраў). Пры неабходнасці вылучаць паласу на праезнай частцы для праходу калоны".**

Калі супрацоўнікі ДАІ не забяспечваюць бесперашкодны рух калоны праз перакрыжаванні, гэта выклікае разрыў калоны і запаволенне яе руху. Часта выкарыстоўваючы гукаўзмацняльную апаратуру патрабуюць вярнуцца на тратуар і выконваць правілы дарожнага руху. Звяртаем увагу, што міжнародныя стандарты ў сферы правоў чалавека дазваляюць выкарыстанне праезнай часткі для рэалізацыі свабоды сходаў.

Назіральнікі ў сваіх справаздачах таксама часта рэкамендуюць праваахоўным органам

**"прызначаць кантактную асобу з ліку супрацоўнікаў міліцыі для камунікацыі з назіральнікамі, СМІ, арганізатарамі і ўдзельнікамі/-цамі мірнага сходу."**

Супрацоўнікі аховы правапарадку часта адмаўляюцца камунікаваць з назіральнікамі аргументуючы гэта тым, што ў іх няма паўнамоцтваў адказваць на пытанні. Відавочна, што прысутнасць кантактнага асобы з ліку супрацоўнікаў міліцыі для камунікацыі павінна спрыяць палегчанай і адкрытай камунікацыі паміж міліцыяй, назіральнікамі, СМІ, арганізатарамі і ўдзельнікамі/-цамі мірных сходаў. Назіральнікі вітаюць пазітыўную практыку прысутнасці на месцы правядзення сходу супрацоўнікаў міліцыі ў форме і апазнавальнай камізэльцы "Інфармацыйная група". Аднак на пытанні пра тое, як і кім ажыццяўляецца ахова правапарадку на месцы сходу, як супрацоўнікі інфармацыйнай групы, так і супрацоўнікі праваахоўных органаў у форме і ў цывільным адмаўляюцца адказваць, спасылаючыся, што ў іх няма на гэта паўнамоцтваў. Пры гэтым, прапануюць звярнуцца па атрыманне інфармацыі ў прэс службу ГУУС Мінгарвыканкама. Згодна з артыкулам 6 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2007 г. № 263-З Аб органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь

**"Дзейнасць органаў унутраных спраў з'яўляецца галоснай, адкрытай для грамадзян і сродкаў масавай інфармацыі ў той меры, у якой гэта не супярэчыць патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб абароне дзяржаўных сакрэтаў і іншай ахоўваемай законам тайны. Органы ўнутраных спраў у парадку і межах, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, інфармуюць дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, сродкі масавай інфармацыі, грамадзян аб стане грамадскага парадку і мерах па яго забеспячэнню".**

Наступная рэкамендацыя адрасаваная органам аховы правапарадку:

**“не спаганяць аплату за паслугі аховы правапарадку пры рэалізацыі людзьмі правы на мірны сход і права на выказванне меркавання”.**

У адпаведнасці з пунктам 5.2 Кіруючых прынцыпаў “Органам публічнай улады варта ўзяць на сябе ўсе выдаткі, звязаныя з забеспячэннем дастатковага ўзроўню бяспекі (уключаючы кіраванне транспартнымі патокамі і вялікай колькасцю людзей). Дзяржава не павінна спаганяць ніякіх дадатковых грашовых збораў за належнае забеспячэнне аховы парадку падчас сходу “. Кошт паслуг міліцыі па ахове парадку прыведзены вышэй і з’яўляецца рэальным абмежаваннем для правядзення мірных сходаў. Напрыклад, у 2019 годзе арганізатары як мінімум 3 традыцыйных пратэстаў сутыкнуліся з фінансавымі цяжкасці: 25 сакавіка, 26 красавіка і 1 траўня.

На жаль, мы фіксуем ігнараванне большай часткі рэкамендацый па выніках назірання і адсутнасць эфектыўнага дыялогу паміж праваабаронцамі і прадстаўнікамі дзяржаўнай улады.



# Рэкамендацыі

## Ураду Беларусі:

1 У цесных кансультацыях з грамадзянскай супольнасцю і іншымі зацікаўленымі бакамі распрацаваць і прыняць нацыянальнае заканадаўства аб мірных сходах, якое будзе адпавядаць міжнародным стандартам;

2 Адмяніць абавязак арганізатараў сходаў аплочваць выдаткі па медыцынскім абслугоўванні, ахове правапарадку і ўборцы тэрыторыі, паколькі гэта з'яўляецца пазітыўнымі абавязацельствамі дзяржавы;

3 Адмовіцца ад практыкі пераследу ўдзельнікаў мірных сходаў толькі за адсутнасць дазволу на яго правядзенне;

4 Не дапускаць затрыманняў і пераследу назіральнікаў і журналістаў, якія ажыццяўляюць сваю законную дзейнасць па асвятленні мірных сходаў;

5 Запрасіць Спецыяльнага дакладчыка ААН па пытанні аб праве на свабоду мірных сходаў і свабоду асацыяцыі для аб'ектыўнай ацэнкі сітуацыі з рэалізацыяй права на мірныя сходы ў Беларусі.

## Органам мясцовай улады:

1 Да прыняцця новага закона аб мірных сходах у Беларусі зьмяніць практыку ўзгаднення масавых мерапрыемстваў, забараняючы правядзенне масавых мерапрыемстваў толькі ў выключных выпадках, пасля ўважлівага аналізу ўсіх магчымых і істотных наступстваў з-за іх правядзення;

2 Не забараняць сходы толькі з-за немагчымасці аплаціць паслугі па іх правядзенні;

3 Аказваць неабходнае садзейнічанне пры арганізацыі і правядзенні мірных сходаў, у тым ліку шляхам кансультацый з арганізатарамі.

## Органам аховы правапарадку:

1. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў павінны насіць форменную вопратку пры забеспячэнні грамадскага парадку падчас мірных сходаў. Супрацоўнікі павінны таксама насіць сродкі індывідуальнай ідэнтыфікацыі (напрыклад, бэйджы, нагрудныя знакі), каб умацаваць давер да супрацоўнікаў міліцыі і каб удзельнікі сходаў мелі магчымасць бесперашкодна да іх звяртацца.
2. пашырыць і замацаваць практыку прысутнасці прадстаўніка інфармацыйнай службы органаў унутраных спраў на масавых мерапрыемствах;
3. забяспечыць высокі ўзровень бяспекі для ўдзельнікаў мірных сходаў, назіральнікаў і журналістаў, у тым ліку ад агрэсіўных дзеянняў трэціх асоб;
4. быць больш адкрытымі з назіральнікамі і журналістамі падчас мірных сходаў, у выпадку неабходнасці аказваць ім неабходнае садзейнічанне.

## Міжнароднай супольнасці:

1. Працягваць маніторынг выканання Рэспублікай Беларусь міжнародных стандартаў, у прыватнасці ў сферы рэалізацыі права на мірныя сходы;
2. аказаць беларускім уладам садзейнічанне ў рэфармаванні заканадаўства аб мірных сходах і практыкі яго прымянення;
3. аказаць дапамогу ў навучанні супрацоўнікаў міліцыі перадавому вопыту ў садзейнічанні і арганізацыі мірных сходаў.




European Center for Not-for-Profit Law Stichting

5 Riviervismarkt, 2513 AM, The Hague, Netherlands

www.ecnl.org

@enablingNGOlaw


European Center for Not-for-Profit Law

#right2freeassembly